# Парадак прыёму грамадзян, іх прадстаўнікоў і прадстаўнікоў юрыдычных асоб у дзяржаўнай установе «Бераставіцкі раённы архіў»

Парадак прыёму грамадзян, іх прадстаўнікоў і прадстаўнікоў юрыдычных асоб у дзяржаўнай установе «Бераставіцкі раённы архіў» (далей – архіў) распрацаваны на падставе Закона Рэспублікі Беларусь ад 18 ліпеня 2011 г. № 300-З «Аб зваротах грамадзян і юрыдычных асоб», Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 15 кастрычніка 2007 г. № 498 «Аб дадатковых мерах па працы са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб».

1. Пры вусным звароце грамадзяне, іх прадстаўнікі, а таксама прадстаўнікі юрыдычнай асобы павінны прад'явіць дакумент, які сведчыць асобу. Прадстаўнікі заяўнікаў павінны прад'явіць таксама дакументы, якія пацвярджаюць іх паўнамоцтвы.

2. Асабісты прыём грамадзян у архіве праводзіць дырэктар архіва.

3. Асабісты прыём грамадзян дырэктарам архіва праводзіцца кожную другую сераду месяца з 08.00 да 13.00.

4. Графік асабістага прыёму грамадзян размяшчаецца ў даступным для агляду месцы ў калідоры 2-га паверха адміністрацыйнага будынка, а таксама на афіцыйным сайце Бераставіцкага раённага выканаўчага камітэта ва ўкладцы «Бераставіцкі раённы архіў».

5. Калі на дзень асабістага прыёму прыпадае дзяржаўнае свята або святочны дзень, абвешчаны Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь непрацоўным, дзень асабістага прыёму пераносіцца на наступны за ім працоўны дзень.

6. Прыём грамадзян у архіве праводзіцца без папярэдняга запісу.

7. Дырэктар архіва мае права адмовіць у асабістым прыёме ў выпадках, прадугледжаных пунктам 2 артыкула 6 Закона Рэспублікі Беларусь ад 18 ліпеня 2011 года «Аб зваротах грамадзян і юрыдычных асоб».